# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА П. С. СМІРНОВА

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – студзень 1943 г.

**Месца дзеяння:**

раён Гарадоцкай і Полацкай шашы г. Віцебска

**Колькасць:**

каля 15 чалавек

**Кіраўнікі:**

Смірноў Пётр Сяргеевіч («Крэмнеў», «Медны»)

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да студзеня 1943 г. Аб'ядноўвала каля 15 чалавек. Кіраўнік П. С. Смірноў («Крэмнеў», «Медны»). У складзе групы былі Р. Л. Голубеў, М. П. Захарава, Т. П., Е. В. і І. І. Нікіціны, Л. Я. Пятроў, В. В. і Н. В. Чыстабаевы, І. Я. Якімаў і яго жонка А. С. Якімава («Бойкая»).

Пётр Сяргеевіч Смірноў, камандзір Савецкай арміі, нарадзіўся ў 1915 годзе. Да службы ў арміі жыў і працаваў у Маскве на абутковай фабрыцы. Ваенную службу праходзіў на Віцебшчыне. Калі трапіў у акружэнне, спрабаваў прабрацца да сваіх, але беспаспяхова.

Разам з палітруком Аляксеем Пятровым быў вымушаны застацца ў Віцебску. З дапамогай мясцовых патрыётаў здабыў дакументы, атрымаў патэнт на адкрыццё абутковай майстэрні па вуліцы 17-й Гарадоцкай, якая стала канспіратыўнай кватэрай для падпольшчыкаў, партызанскіх сувязных, армейскіх разведчыкаў.

Спачатку падпольшчыкі збіралі зброю, боепрыпасы, узрыўчатку, распаўсюджвалі лістоўкі і вялі прапаганду. Член групы Я. І. Хмялёў, які працаваў камендантам групы дамоў, прапісваў у горадзе патрэбных падпольшчыкам людзей. Пад выглядам вечарынак у свабодным пакоі барака № 6 звычайна праходзілі сустрэчы патрыётаў.

Смірноў арганізаваў разведку ваенных аб'ектаў ворага ў Віцебску і яго наваколлі і наносіў іх на план горада. У студзені 1943 г. ён перадаў гэты план Віцебскаму

падпольнаму абкаму КП(б)Б. Група ўдзельнічала ў дыверсіях на чыгунцы і шашэйных камунікацыях. У канцы 1942 г. на перагоне Віцебск – Княжыца змагары пусцілі пад адхон паравоз і 2 платформы з ваенным грузам, прыпынілі рух на 10 гадзін, спалілі 6 цыстэрн з бензінам, нямецкі эвакапункт.

Многія дыверсіі праводзіліся сумесна з падпольнымі групамі М. Я Нагібава, Ф. К. Мехава і А. А. Гагулі. У студзені 1943 г. Смірноў і Якімавы атрымалі ў 1-ай Віцебскай партызанскай брыгадзе тол для сваёй групы, які везла А. С. Якімава. Падпольшчыцу арыштавалі. На наступны дзень былі схоплены П. С. Смірноў і І. І. Нікіціна. Пасля жорсткіх катаванняў гітлераўцы расстралялі Г. Л. Голубева, М. П. Захараву, І. І. Нікіціну, П. С. Смірнова, В. В. Чыстабаеву, А. С. Якімаву. У баях з ворагам загінуў І. Я. Якімаў.

У Віцебску на доме № 1 па вуліцы Ленінградскай, у якім жыў П. С. Смірноў, устаноўлена мемарыяльная дошка. 4 члены группы, у тым ліку Л. Я. Пятроў, узнагароджаны ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга, П. С. Смірноў – медалём «За адвагу».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група П. С. Смірнова / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 497.

2. **Коммунисты** собирают силы // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 40–56.

3. **Подпольная** группа Смирнова П. С. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 295–296.